ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986

13 САКАВІКА

№ 9(1495)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Рашэнні XXVII з'езда КПСС — выканаем!

ЗАЦВЯРДЖАЦЬ СЯБЕ СПРАВАЙ

ПАДЗЕЯ, якую чакалі з нецярплівасцю і да якой ішлі з вялікім натхненнем усе савецкія людзі, — XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза закончыў сваю работу. Чытаючы і перачытваючы матэрыялы з'езда, не перастаеш здзіўляцца, як глыбока, пераканаўча адлюстраваны ў гэтых дакументах не толькі глабальныя, шырокамаштабныя задачы пабудовы нашага грамадства, але і многія грані, ракурсы адценні велізарнага ракурсу пытанняў. На першы погляд гэта здаецца неверагодным. Але ўнікаеш глыбей у радкі — і за кожным словам бачыш вялікі сэнс.

Гэта ж можна сказаць і ў адносінах да камсамола. Задачам ВЛКСМ на сучасным этапе развіцця сацыялістычнага грамадства ў Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з'езду адведзена некалькі абзацаў. І ў той жа час тут нямала пытанняў, якія прама ці ўскосна адносяцца да дзейнасці камсамола.

Адзін з асноўных момантаў — гэта метады работы камсамольскіх арганізацый. Дайсці да кожнай камсамольскай групы, да кожнага камсамольца, пранікнуцца яго думкамі, імкненнямі, дапамагчы асэнсаваць, што ад кожнага залежыць агульная справа — толькі пры такіх умовах наша маладзёжная арганізацыя атрымае магчымасць рашаць надзённыя задачы выхавання чалавека сапраўды камуністычнай перакананасці. Без апоры на ўсіх без выключэння камсамольцаў, выкарыстоўваючы сілы толькі штатнага апарату, працуючы бюракратычна — поспехаў нам не дасягнуць!

Зразумела, як і ў любой рабоце, тут могуць быць спачатку і зрывы, і няўдачы. Іх не трэба баяцца. Хаваючы іх, мы ашукваем самі сябе. Гэта пытанне аб публічнасці. Толькі дзелавыя, прынцыповыя адносіны да рашэння ўсіх задач, якія стаяць перад намі, гарантуюць плённую і рэзультатыўную работу.

Карэнная задача камсамольскіх арганізацый — выхаванне маладых людзей у духу найглыбейшага патрыятызму, інтэрнацыяналізму, адданасці Радзіме. І хто, як не нашы старэйшыя таварышы — ветэраны вайны і працы,— можа аказаць у гэтай справе каштоўную дапамогу?! Іх жыццё пераплятаецца з багатай гісторыяй нашай краіны. Важна, каб моладзь успрыняла гэту гісторыю, усё тое лепшае, перадавое, што складае гонар савецкага чалавека.

Але пры гэтым нельга забываць, што і ветэраны адчуваюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы моладзі. Уважлівасць да тых, каму мы абавязаны сваім жыццём і ўсімі яе радасцямі,— хіба гэта не вялікі і не адказны абавязак кожнага камсамольца?

Сёння многія з нашых таварышаў з універсітэцкіх аўдыторый ідуць у рады Савецкай Арміі, каб мы маглі спакойна вучыцца і працаваць. Сумленна выканаўшы свой абавязак перад Радзімай, яны вернуцца, каб прадоўжыць ажыццяўленне сваіх мэт. Задача камсамола заключаецца ў тым, каб усебакова падрыхтаваць юнакоў да выканання грамадзянскага абавязку і каб пасля вяртання дапамагчы ім хутчэй уліцца ў калектыў.

Гаворачы аб апошніх рашэннях партыі і ўрада Савецкай краіны, трэба спыніцца на разгорнутай барацьбе супраць п'янства і алкагалізму. Значэнне гэтых мер цяжка пераацаніць. І камсамолу адводзіцца тут вялікі ўчастак цяжкай, але высакароднай работы. Ад таго ж, якімі уступяць у жыццё сённяшнія дзяўчаты і юнакі, залежыць выключна ўсё ў заўтрашнім дні нашага грамадства. Прамаруджванне з гэтай праблемай тоіць у сабе небяспечныя вынікі. Работу гэту трэба весці ўпарта і паслядоўна. У дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова адзначаецца факт нездавальняючага выкарыстання палацаў, клубаў, стадыёнаў — усяго таго, дзе з цікавасцю і карысцю можна правесці вольны час. Неабходна таксама шукаць і іншыя, больш прывабныя формы адпачынку моладзі.

Усё сказанае — гэта толькі некаторыя моманты ў дзейнасці нашай камсамольскай арганізацыі. Яе ўмацаванне і расшырэнне — наш камсамольскі абавязак.

А. БУМБЛІС,
адказны за ваенна-патрыятычную работу камітэта камсамола хімічнага факультэта.

ПОСПЕХ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС!

ЗАКОНЧЫЎ сваю работу XXVII з'езд КПСС. Галоўная задача ўсяго савецкага народа — старанна працаваць над выкананнем рашэнняў з'езда.

Палітычны даклад ЦК XXVII з'езду з'яўляецца важнейшым тэарэтычным дакументам нашага часу. Ён мае выключна вялікае значэнне не толькі для савецкага народа, але і для камуністаў усяго свету. Дакументы, якія абмяркоўваліся на з'ездзе, змяшчаюць глыбокае навуковае абгрунтаванне палітыкі партыі, палітыкі нашага народа. Вялікая ўвага надаецца эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю краіны. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны накіравана найперш на паляпшэнне ўмоў жыцця і быту савецкіх людзей.

Не засталіся без увагі на з'ездзе і пытанні вышэйшай школы. Для таго, каб вышэйшая навучальная ўстанова рыхтавала высокаадукаваных спецыялістаў, патрэбна значна палепшыць матэрыяльную базу ВНУ, забяспечыць сродкамі тэхнічнага навучання, адпавядаючымі ўзроўню навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Заклікаю ўсіх студэнтаў з яшчэ большай настойлівасцю і ўпартасцю вучыцца, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці факультэтаў і універсітэта, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Р. ЖМОЙДЗЯК,
дэкан геаграфічнага факультэта.

Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

спаборніцтва па лыжных гонках, якія праводзіліся з 3 па 5 сакавіка ў раёне станцыі «Зялёнае». Першае месца заваяваў гістарычны факультэт, другое — геаграфічны, на трэцім — юрыдычны.

Памераліся сіламі і штангісты. Трэба адзначыць, што папулярнасць гэтага віду спорту ў БДУ расце. Упершыню колькасць штангістаў налічвала 107 чалавек, пры тым, што зборная каманда ў гэты час удзельнічала ў рэспубліканскім спаборніцтве сярод юніёраў. На першае месца выйшлі цяжкаатлеты юрыдычнага факультэта, на другое — гістарычнага, на трэцяе — геаграфічнага.

В. КАВАЛЁЎ.

ПРАЙШОЎ ТЫДЗЕНЬ

савецка-чэхаславацкай дружбы. У яго рамках былі арганізаваны гутаркі на першым курсе гістарычнага факультэта і ў школах Мінска, віктарына аб ЧССР (пераможца — Марына Цернавая, студэнтка V курса гістарычнага факультэта, аддзяленне гісторыі), спартыўныя спаборніцтвы па валейболу. Завяршыўся тыдзень вечарам інтэрнацыянальнай дружбы, на якім былі падведзены вынікі, паказана слайд-праграма аб ЧССР, прадстаўлена мастацкая самадзейнасць чэхаславацкіх студэнтаў.

А. САМУЙЛІЧ.

ПАСЯДЖЭННЕ КВК ПРАФКОМА

сумесна з адказнымі за культурна-выхаваўчую работу ў інтэрнатах вызначыла далейшыя задачы па падрыхтоўцы і правядзенню агляду-конкурсу на лепшае афармленне ленінскіх пакояў.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

СЁННЯ

ў 19.30 у актавай зале БДУ імя У. І. Леніна адбудзецца рапарт-канцэрт фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш». Пасля канцэрта — дыскатэка.

М. ТАРАСАВА.

У САКАВІКУ

ў акадэмічных групах універсітэта пройдуць камсамольскія сходы з адзіным парадкам дня: задачы камсамольскіх арганізацый, якія вынікаюць з рашэнняў XXVII з'езда КПСС, і палітычны залік, прысвечаны 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

А. СКОК.

РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

Наш Дзіма

ЯГО БУДУЧАЯ прафесія — самая што ні на ёсць мірная. Будзе працаваць выкладчыкам хіміі ў школе. Ён вырашыў аднойчы і назаўсёды займацца хіміяй, вучыць дзяцей. А калі пасля службы ў радах Савецкай Арміі зноў прыйшоў на факультэт, на прапанову перайсці на вытворчы паток адказаў проста і лаканічна: «Не».

Сяргей Яновіч, яго аднакурснік, гаворыць пра Дзіму:

— Цікавы і захоплены чалавек. І справа тут не толькі ў тым, што ведае Дзіма шмат, вясёлы заўсёдны, умее спяваць і іграць на гітары, маляваць шаржы, што... Не, проста чалавек ён своеасаблівы.

— У ім няма фальшу, найгранага альбо ўзятага ў каго-небудзь іншага. Ён заўсёды толькі ён,— сцвярджаюць у адзін голас аднакурснікі.

Васіль Тарасевіч:

— Ведаеце, якім адным словам можна ахарактарызаваць Дзіму? Аптыміст! У цяжкі жыццёвы момант ён не разгубіцца, абавязкова адшукае выйсце.

Сяргей Яноўскі:

— Да яго можна прыйсці ў любы час. Ён ніколі не трэба ні аб чым прасіць. Ён зразумее ўсё адразу сам і дапаможа.

Аляксандр Бумбліс:

— На першы погляд проста вясёлы хлопец. І нічым не вызначаецца. Але бачылі б вы яго твар на партыйным сходзе: сама сур'ёзнасць і сабранасць.

Васіль Тарасевіч:

— Так, ён можа і ўмее смяяцца, жартаваць, а вось калі даходзіць да справы...

Аляксандр Плавінскі:

— ...тады Дзіма наш проста незаменны. Усё, што яму даручылі, абавязкова выканае.

Так гавораць пра Дзіму яго сябры. А сам лічыць, што такіх, як ён, шмат, што ён самы звычайны. Яму падабаецца, каб былі жарты і смех і многа сяброў побач. Яму падабаецца вучыцца. Ён марыць аб тым часе, калі сам будзе вучыць дзяцей. І мне верыцца, што не толькі аб таямніцах навукі хіміі даведаюцца яго вучні — ён дапаможа ім пазнаць усё разумнае, добрае, вечнае...

Нядаўна Дзмітрый Кляйменычаў, студэнт II курса хімічнага факультэта, кандыдат у члены КПСС атрымаў медаль «За адвагу», якім ён узнагароджаны за мужнасць, праяўленую пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

М. ЗАГОРСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Супрацоўнікі кафедры неарганічнай хіміі, НДІ фізіка-хімічных праблем, СКТБ распрацавалі і ўкаранілі ў вытворчасць электрахімічныя працэсы, якія забяспечваюць на паверхні вырабаў з алюмінію і яго дэфармуемых сплаваў ахоўна-дэкаратыўныя аксідныя пакрыцці. На алюміній навучыліся рабіць надпісы і малюнкі, якія валодаюць дастаткова высокім супраціўленнем зносу і ўстойлівасцю да сонечнага і атмасфернага уздзеяння. Распрацоўка ўкаранёна на вытворчых аб'яднаннях «Інтэграл», «Гарызонт», плануецца яе выкарыстанне для абліцоўкі Мінскага метрапалітэна.

НА ЗДЫМКУ: аўтары распрацоўкі абмяркоўваюць вынікі чарговага эксперыменту.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

РЭФОРМЕ ШКОЛЫ — КЛОПАТ ВНУ!

ЗВАРОТ

калектыву філалагічнага факультэта да кафедр і навуковых падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

Дарагія калегі! У сучасны момант па ўсёй краіне шырока разгорнута праца па ажыццяўленню значных перамен ва ўсіх сферах эканамічнага і грамадскага жыцця, па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Праводзіцца вялікая работа па ажыццяўленню Закона «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы». Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна на працягу многіх гадоў вядзе падрыхтоўку педагагічных кадраў для работы ў агульнаадукацыйнай і прафесійнай школе. Зараз універсітэт працягвае актыўную перабудову сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона аб школьнай рэформе. На ўсіх факультэтах, якія рыхтуюць настаўнікаў, распрацоўваюцца планы бесперапыннай педагагічнай практыкі, пачынаючы з першага і заканчваючы пятым курсам. Вучоныя універсітэта прыступілі да напісання серыі брашур «Вучоныя універсітэта — школе».

Канкрэтны ўклад у паспяховае ажыццяўленне Закона «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы» ўносіць і калектыў філалагічнага факультэта. Сіламі выкладчыкаў факультэта рыхтуюцца, выдаюцца і перавыдаюцца для пачатковых, васьмігадовых і сярэдніх агульнаадукацыйных школ падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, навукова-метадычныя распрацоўкі ў дапамогу настаўніку па рускай і беларускай мове і літаратуры.

За 1985 год выдадзена 27 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы, у тым ліку 12 для сярэдніх агульнаадукацыйных школ. Вучоныя факультэта пастаянна чытаюць лекцыі для работнікаў народнай асветы ў інстытутах удасканалення настаўнікаў школ БССР.

Пры актыўным удзеле прафесарска-выкладчыцкага калектыву факультэта ў рэспубліцы штогод праводзяцца рэспубліканскія, гарадскія, раённыя алімпіяды школьнікаў па рускай і беларускай мове і літаратуры.

Прааналізаваўшы зробленае і ўскрыўшы рэзервы паляпшэння ўсёй работы па аказанню дапамогі агульнаадукацыйнай школе, канкрэтызуючы свой удзел у агульнадзяржаўнай справе, калектыў філалагічнага факультэта прымае на сябе мэтавыя сацыялістычныя абавязацельствы. Яны накіраваны на ўдасканаленне ўсёй работы калектываў кафедр па ўкараненню ў жыццё Закона «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы».

МЭТАВЫЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЎКЛЮЧАЮЦЬ:

1. У 1986—87 навучальным годзе пачаць падрыхтоўку, а ў 1988—89 навучальным годзе правесці сумесна з МінВНУ БССР, Міністэрствам асветы БССР з удзелам выкладчыкаў ВНУ, а таксама настаўнікаў, метадыстаў, практыкаў рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю «Змест навучання беларускай і рускай мове і літаратуры ў святле рэформы агульнаадукацыйнай школы».

2. Прыняць удзел у абмеркаванні праграм і падручнікаў па беларускай і рускай мове і літаратуры для агульнаадукацыйных школ:

а) «Беларуская мова» (III клас для школ з рускай мовай навучання);

б) «Русский язык в 5—6 классах: дидактический материал»;

в) «Толковый словарь русского языка для средней школы»;

г) «Методика преподавания русского языка в школе». Падручнік для студэнтаў-філолагаў універсітэтаў;

д) «Русский язык» (5—6 класы школ з беларускай мовай навучання);

е) «Русский язык» (IV клас школ з беларускай мовай навучання);

ж) «Беларуская літаратура». VIII клас. Хрэстаматыя для сярэдняй школы;

з) «Русский язык». Дапаможнік;

і) «Методыка выкладання беларускай літаратуры ў сярэдняй школе». Хрэстаматыя.

4. На высокім ідэйна-палітычным і навукова-метадычным узроўні забяспечыць чытанне лекцый па праблемах мовазнаўства і літаратуразнаўства ў Рэспубліканскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў.

5. Значна паглыбіць змест і пашырыць напрамкі работы камісіі факультэта па вывучэнню зваротнай сувязі «ВНУ — школа — ВНУ». Больш увагі звярнуць на назапашванне матэрыялаў аб працы выпускнікоў універсітэта ў школах, абагульняць вопыт работы з выпускнікамі, распрацоўваць рэкамендацыі кафедрам па ўдасканаленню падрыхтоўкі настаўнікаў. Наладжваць кансультацыі для выпускнікоў факультэта, настаўнікаў школ па сучасных праблемах мовазнаўства і літаратуразнаўства, па навінках навуковай літаратуры і літаратурнага працэсу.

6. Дэканату, кафедрам, грамадскім арганізацыям распрацаваць комплекс мерапрыемстваў па ўмацаванню сувязей факультэта са школамі рэспублікі, дзе вызначыць удзел калектыву, кожнай кафедры, кожнага работніка ў выкананні прынятых мэтавых сацабавязацельстваў.

7. Кафедрам факультэта ажыццявіць 1—2 калектыўныя выезды выкладчыкаў па лініі таварыства «Веды» у раёны рэспублікі з выступленнямі па актуальных праблемах мовазнаўчай і літаратуразнаўчай навукі з мэтай правядзення канкрэтнай і грунтоўнай прафарыентацыйнай работы сярод выпускнікоў школ.

Мэтавыя сацыялістычныя абавязацельствы ўключаюць у сябе яшчэ шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па аказанню дапамогі органам асветы ў ажыццяўленні рэформы школы.

Прафесарска-выкладчыцкі калектыў філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна звяртаецца да калектываў усіх факультэтаў і падраздзяленняў з заклікам — прыняць мэтавыя сацыялістычныя абавязацельствы па аказанню дапамогі і садзейнічанню школьнай рэформе, мабілізаваць усіх на выкананне гэтай ключавой задачы. Надзённым клопатам кожнага калектыву павінна стаць актыўнае умацаванне дзелавых сувязей і творчых кантактаў з органамі народнай асветы. Сёння час патрабуе ад усіх нас рашуча павярнуцца да патрэб школы, усямерна садзейнічаць хутчэйшаму росту і найбольш якаснай перабудове агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы.

Сканцэнтраванасць агульных намаганняў на канкрэтным участку работы, на наш погляд, будзе садзейнічаць актывізацыі дзейнасці калектыву, адказнасці кожнага за агульную справу, павінна паслужыць трывалай асновай для далейшага ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі і выхавання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

Удзел у ажыццяўленні школьнай рэформы — пачэсная і ганаровая справа кожнага калектыву, кожнага работніка.

Зварот прыняты на сходзе прафсаюзнага калектыву філалагічнага факультэта.

ЯК НАВУЧЫЦЬ ВУЧЫЦЦА?

ВЕДАМ — ЯКАСЦЫ

СТУДЭНЦКІЯ гады — гэта час, калі не толькі набываюцца неабходныя веды па спецыяльнасці, але і фарміруюцца духоўны свет чалавека, яго мэтавыя ўстаноўкі, маральна-этычныя і эстэтычныя погляды і нормы паводзін, светапогляд у цэлым. Як найлепш вучыцца студэнту, каб паспяхова пераадолець гэты шлях? На пытанні нашага карэспандэнта адказвае загадчык кафедры кібернетыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар А. С. МІХАЛЁЎ.

— У НАШ час паток інфармацыі ўзрастае небывалымі тэмпамі. Пры гэтым павялічваецца і яго складанасць. Інфармацыя становіцца больш навукаёмкай, спецыяльнай. Усё гэта надае інтэнсіўнасць і без таго працаёмкаму працэсу навучання. Аляксандр Сяргеевіч, у чым жа заключаецца поспех навучання ў сучасній ВНУ?

— ВЯДОМА, што поспех навучання ў ВНУ залежыць перш за ўсё ад таго, у якой ступені сам студэнт разумее свае задачы. Акрамя гэтага, неабходна сістэматычная і руплівая праца па авалоданню вяршынямі будучай прафесіі, пастаянная псіхалагічная падрыхтаванасць да ўспрымання ўсё новай і новай інфармацыі і яе перапрацоўцы ў веды. Відавочна, што выдаткі працы на авалоданне ведамі залежаць ад таго, наколькі правільна арганізавана сама праца.

— У АПОШНІ час у сувязі з гэтымі праблемамі вядзецца пошук рэзерваў у навучанні. Усё больш увагі надаецца навуковай арганізацыі працы. Раскажыце, калі ласка, аб галоўных момантах і заканамернасцях у гэтым напрамку?

— УЛІЧВАЮЧЫ актуальнасць гэтай праблемы для студэнцкай аўдыторыі, разгледзім некаторыя галоўныя моманты навуковай арганізацыі вучобы, якія і вызначаюць у асноўным уменне вучыцца. Агульнавядома, што аб'ём інфармацыі, які засвойвае студэнт, практычна заўсёды менш таго аб'ёму, што даюць выкладчыкі. Засваенне матэрыялу будзе лепшым, калі студэнт умее граматна весці свае канспекты і г. д. У той жа час засваенне значна памяншаецца з-за стомленасці студэнтаў у ходзе лекцый, вучэбнага дня, тыдня, семестра.

Эксперыментальна даказана, што калі на лекцыі студэнты працуюць з установкай толькі запомніць матэрыял без яго глыбокага асэнсавання і разумення, то ўжо праз тыдзень яны змогуць узнавіць толькі чвэрць ад першапачатковага аб'ёму. Зусім другі малюнак назіраецца, калі ў аўдыторыі студэнты імкнуцца не толькі запомніць, але і, перш за ўсё, зразумець выкладаемы матэрыял. У гэтым выпадку у іх памяці захоўваецца ўжо 60—70 працэнтаў інфармацыі.

Такім чынам, неабходна імкнуцца да высвятлення і разумення пэўных заканамернасцей, ці, іншымі словамі, запамінаць не саму інфармацыю, а алгарытмы яе атрымання, не вынік дзеяння аб'ектыўных законаў, а самі законы. Такі падыход як бы ўкамплектоўвае інфармацыю, пазбаўляе мозг ад працы па яе захаванню для творчых працэсаў.

— ЗРАЗУМЕЛА, працэс навучання ў аўдыторыі не заканчваецца. Засвоіць матэрыял глыбей дазваляе самастойная праца?..

БЕЗУМОЎНА. Вопытныя студэнты, напрыклад, імкнуцца ў той жа дзень, звычайна вечарам, прагледзець канспект праслуханай сёння лекцыі. На гэта ідзе не больш, чым 15—20 мінут, але эфект настолькі вялікі, што ў шэрагу выпадкаў можна абмежавацца толькі адной-дзвюма самастойнымі прапрацоўкамі лекцыі на працягу семестра для добрага разумення ўсяго курса. Пасіўная стратэгія навучання, гультайства на працягу семестра хутка прыводзяць да таго, што студэнты трапляюць у лік «хранічных хвасцістаў» і знаходзяцца ў далейшым у пастаянным стрэсавым напружанні перад пагрозай быць выключанымі з навучальнай установы. Рытмічная ж праца на працягу семестра не патрабуе такіх псіхафізічных перанапружанняў і з'яўляецца добрай асновай для набыцця трывалых ведаў.

— І АПОШНЯЕ пытанне. Якімі ж якасцямі павінен валодаць сучасны студэнт?

— Падводзячы вынікі, можна вызначыць, што уменне вучыцца складаецца, перш за ўсё, з наступных элементаў:

Сур'ёзных і ўдумлівых адносін да самога працэсу навучання, псіхалагічнага настрою на авалоданне вяршынямі будучай прафесіі, жадання стаць высокакваліфікаваным спецыялістам.

Умення канцэнтраваць сваю ўвагу, памяць, волю на выкладаемым у аўдыторыі матэрыяле з абавязковай псіхалагічнай устаноўкай зразумець яго асноўны змест.

Умення рытмічна і прадукцыйна працаваць у семестры самастойна. Іншымі словамі, другую палову шляху да ведаў студэнт павінен прайсці сам.

Інтэрв'ю правёў
К. БЕЛАВУС.

СПАДЧЫНА

У гонар вучонага

АДБЫЛОСЯ пашыранае пасяджэнне семінара па краявых задачах і асобых інтэгральных ураўненнях, прысвечанае 80-годдзю з дня нараджэння акадэміка АН БССР Ф. Д. Гахава — заснавальніка і кіраўніка семінара з 1961 па 1980 гады. Для ўдзелу ў рабоце семінара прыехалі спецыялісты з вядучых навуковых цэнтраў нашай краіны.

Адкрыў пасяджэнне семінара загадчык кафедры тэорыі функцый прафесар Э. І. Звяровіч. Ва ўступным слове сакратара парткома Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна прафесара М. І. Юрчука была дадзена высокая ацэнка ўкладу Ф. Д. Гахава ў развіццё навуковых даследаванняў і матэматычнай адукацыі ў нашай краіне і ў рэспубліцы. Ф. Д. Гахаў заснаваў беларускую школу па краявых задачах, быў ініцыятарам правядзення рэспубліканскіх матэматычных канферэнцый і матэматычных алімпіяд.

Даклады ўдзельнікаў семінара мелі аглядны характар або змяшчалі арыгінальныя навуковыя вынікі. Вялікую цікавасць выклікалі выступленні вучняў Ф. Д. Гахава.

Удзельнікі семінара абмяняліся інфармацыяй аб апошніх дасягненнях у розных навуковых цэнтрах краіны, аб некаторых новых напрамках. У цэлым пасяджэнні, на якіх прысутнічала каля 100 чалавек, далі новы імпульс далейшаму развіццю тэорыі краявых задач і асобых інтэгральных ураўненняў у Беларусі і, у прыватнасці, на кафедры тэорыі функцый Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, на базе якой і была арганізавана работа семінара.

А. КІЛБАС,
дацэнт кафедры
тэорыі функцый.

КУРСАМ ПАСКАРЭННЯ

НДІ ФХП: навуковыя і ненавуковыя праблемы

НДІ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ малады па дзвюх прычынах. Па-першае, ён створаны ў 1978 годзе, а васьмігадовы тэрмін можна смела аднесці да перыяду станаўлення. Па-другое, інстытут малады сваімі супрацоўнікамі, сярэдні ўзрост якіх не перавышае 30 гадоў. Тым не менш інстытут з'яўляецца дастаткова магутнай навукова-даследчай адзінкай са значнай матэрыяльнай базай, высокай прафесійнай падрыхтоўкай супрацоўнікаў, дакладным разуменнем пастаўленых задач і шляхоў іх рашэння. Пацвярджэннем служаць вынікі работы ў XI пяцігодцы.

АСНОЎНАЯ частка распрацовак вядзецца на ўзроўні вынаходніцтваў. У 1984 годзе інстытутам атрымана 80 станоўчых рашэнняў на вынаходніцтвы, у 1985 м — 54, а ўсяго за пяцігодку больш як 270. Штогод калектывам інстытута друкуецца звыш 300 артыкулаў і тэзісаў дакладаў у міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх часопісах і зборніках.

Але, акрамя поспехаў, калектыў інстытута бачыць і шэраг недахопаў у сваёй навуковай рабоце. Гэта — нізкі працэнт укаранення вынаходніцтваў у народную гаспадарку, недастатковы ўзровень патэнтавання распрацовак інстытута за мяжой. Прамая сувязь тут прасочваецца з павышэннем кваліфікацыі супрацоўнікаў. Калі з абаронай кандыдацкіх дысертацый справы ідуць дастаткова добра (у сярэднім штогод абараняецца каля 7 кандыдацкіх дысертацый), то з пытаннем абароны доктарскіх дысертацый праблем шмат (абаронена толькі 1 дысертацыя — на 70 кандыдатаў навук).

Шэраг распрацовак супрацоўнікі праводзяць для прамысловых прадпрыемстваў. Штогод выконваецца гаспадарча-дагаворных работ на сумму больш як 800 тысяч рублёў, наладжаны цесныя творчыя сувязі з галіновымі інстытутамі. НДІ ФХП супрацоўнічае з 55 беларускімі прадпрыемствамі і арганізацыямі, у тым ліку з 45 у Мінску.

У XI пяцігодцы інстытут з'яўляўся выканаўцам трох рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, паспяхова выканаў 8 заданняў Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР па вопытна-прамысловай праверцы і ўкараненню вынікаў НДР. Прадстаўлены прапановы па ўдзелу НДІ ФХП у XII пяцігодцы ў 5 рэспубліканскіх комплексна-мэтавых і важнейшых навукова-тэхнічных праграмах, у тым ліку ў праграме «Інтэнсіфікацыя», 10 работ прапанавана ў сістэму «Навука — вытворчасці».

Шэраг прыкладных распрацовак інстытута адзначаны медалямі і дыпломамі ВДНГ БССР і СССР. Усяго ў XI пяцігодцы супрацоўнікамі атрымана 17 медалёў ВДНГ СССР, у тым ліку 2 залатыя і 3 сярэбраныя і больш чым 30 дыпломаў ВДНГ БССР. Эканамічны эфект ад укаранення распрацовак ў народную гаспадарку за пяцігодку склаў больш як 15 мільёнаў рублёў.

Гаворачы аб дасягненнях, нельга не спыніцца на фактарах, якія тармозяць паспяховую работу. Ужо не першы год дэбатуецца ва ўсіх універсітэцкіх інстанцыях пытанне аб выцяжной сістэме хімічнага корпуса. Усе добра ведаюць, што хімікі часта працуюць з небяспечнымі для здароўя рэчывамі, што гэта патрабуе абсталявання памяшканняў высокаэфектыўнай выцяжной сістэмай. Сучасная сістэма хімічнага корпуса не вытрымлівае ніякай крытыкі.

Не менш важным з'яўляецца пытанне і аб зліве вадкіх адходаў хімічных эксперыментаў, якія таксама прадстаўляюць небяспеку для чалавека. Раней каля хімічнага корпуса была зроблена бетонная яма, у якую зліваліся ўсе адходы і спальваліся. Потым яе ліквідавалі, і цяпер вадкія адходы або трапляюць у каналізацыю, або захламляюць лабараторыі.

Трэба як мага хутчэй вырашаць усе гэтыя набалелыя пытанні!

Маладосць інстытута дае падставу думаць, што ўсе негатыўныя моманты будуць ліквідаваны і ў XII пяцігодцы НДІ ФХП выйдзе на новыя якасныя рубяжы.

А. ПАЎЛАЎ,
старшыня прафбюро
НДІ ФХП.

КАМУ ПАТРЭБНЫ ДВОЕЧНІК?

ЦІХІ, спакойны двоечнік. Начапляе ў сесію «хвастоў» і знікае ў пошуках выкладчыкаў для іх пераздачы. Але як бы ён ні імкнуўся быць незаўважаным, вядома, усё ж адшукаюць яго, каб на сход камсамольскі запрасіць. Паўшчуваюць там, шэфства возьмуць. Тады, глядзіш, зноў грамадскасць турбуецца. Справа да камітэта камсамола даходзіць. Тут ужо без вымовы ніяк не абысціся. Могуць нават у асабістую картку камсамольца вымову запісаць. А што яму, двоечніку? З яго нязменным

— У школе вучылася на «4» і «5»,— скажа пазней Г. Ярашэвіч.— Вырашыла паступаць ва універсітэт. Экзамены здала без цяжкасцей, а потым, не зразумеўшы сістэму навучання ва універсітэце, стала прапускаць заняткі, думала, і сесію здам лёгка...

Няведанне самаўпэўненай першакурсніцы сутыкнулася з няўважлівасцю старшакурснікаў, камітэта камсамола. Хаця Ірына Амброс, адказная за акадэмсектар, і дэканату — усім, хто адказны за выхаванне будучага спецыяліста.

ПАД ВОСТРЫМ ВУГЛОМ

«што гэта за студэнт, які двойкі не атрымаў»? Так і будзе цягнуць гэту лямку, пакуль не дасягне свайго апагею, не стане «маладым спецыялістам».

А зараз дазволь цябе, паважаны чытач, пазнаёміць з прадстаўнікамі гэтага кантынгенту студэнцтва: Галіна Ярашэвіч, студэнтка I курса геаграфічнага факультэта, Жанна Баскакава, студэнтка IV курса геаграфічнага факультэта, Міхаіл Афанасьеў, студэнт I курса факультэта радыёфізікі і электронікі. Іх асабістыя справы разглядаліся на сумесным пасяджэнні адказных за акадэмработу на факультэтах і старшынь «Камсамольскіх пражэктараў» факультэтаў.

З камсамольскай характарыстыкі Галіны Ярашэвіч. «Да вучобы адносілася нядобрасумленна. Часта прапускала лекцыйныя і практычныя заняткі. У сувязі з тым, што было шмат прапушчана, Ярашэвіч не змагла ў кароткі тэрмін самастойна вывучыць вялікі аб'ём матэрыялу». Так Галіна стала ўладальніцай нездавальняючых адзнак.

Але...

— Толькі пасля сесіі зрабіла вывады,— так шчыра прызнаецца Галіна Ярашэвіч.

А калі будзе рабіць вывады Жанна Баскакава? Як-ніяк, а яна ўжо студэнтка IV курса. З камсамольскай характарыстыкі Ж. Баскакавай: «За час вучобы ва універсітэце Ж. Баскакава мела пасля здачы кожнай сесіі нездавальняючыя адзнакі, і вялікую колькасць прапушчаных заняткаў без усякіх на тое прычын. У апошнюю сесію атрымала 2 нездавальняючыя адзнакі». Да таго ж, Ж. Баскакава мела шмат вымоў.

Пытанне ўзнікае само: які з вас будзе спецыяліст, Жанна?

— У прынцыпе, падабаецца, лічу, што буду добрым спецыялістам...

Падабаецца што? Мець запазыкі? Пытанне застаецца без адказу.

— Але якім педагогам будзеце вы? Таксама нездавальняючым?

— Будзе цяжка працаваць. Часам прыходзяць такія думкі...

Згадзіцеся, над пастаўленым шматкроп'ем ёсць сэнс задумацца не толькі адной Жанне.

— Мы не можам справіцца з двоечнікамі. Так многа звалілася на такі малы факультэт,— прызнанне Ірыны Амброс таксама наводзіць на роздум...

— Што расказваць?— М. Афанасьеў быў сапраўды нешматслоўным.— На падрыхтоўчым аддзяленні вучыўся на тройкі, адчуваў, што цяжка. І пасля першай сесіі на факультэце радыёфізікі і электронікі меў запазыкі. Не пераздаваў іх. Думаў, што не пераздам. Былі пропускі, але я іх не лічыў. Больш за ўсё не хадзіў на практычныя заняткі. Дрэнна давалася мне рашэнне задач, таму я і прапускаў, займаўся ў інтэрнаце...

Вучэнне дзеля забавы. Іменна такой уяўлялі сабе вучобу ва універсітэце гэтыя студэнты, забыўшыся на свой галоўны абавязак — добра і старанна вучыцца. А калі ім яшчэ патураюць, то наогул час знаходжання ва універсітэце ператвараецца ў час вяселля і забаў.

Двоечнік — гэта яшчэ не толькі той, хто атрымлівае нездавальняючыя адзнакі. Студэнт-двоечнік сёння — гэта двоечнік-спецыяліст заўтра. Ці такое прызначэнне мае вышэйшая школа? Аб гэтым трэба добра памятаць і камсамольскай групе, і акадэмсектару, і дэканату — усім, хто адказны за выхаванне будучага спецыяліста.

А. МАТУСЕВІЧ.
наш кар.

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

«ТАЙНАЯ ВЯЧЭРА»

НА ФЕЛЬЕТОН «Тайная вячэра», апублікаваны ў «Беларускім універсітэце» 23 студзеня 1986 года, загадчык падрыхтоўчага аддзялення В. Краснапрошын адказвае: *Паводзіны слухачоў падрыхтоўчага аддзялення С. Додзя, А. Панцялея, І. Хамайко абмеркаваны на пасяджэнні камітэта камсамола ПА. За парушэнне норм сацыялістычнага супольнага жыцця рашэннем бюро камітэта камсамола яны выключаны з членаў ВЛКСМ.*

Гэтае здарэнне абмеркавана на камсамольскіх сходах груп. У мэтах прадухілення такіх выпадкаў распрацаваны мерапрыемствы па паляпшэнню культурна-масавай і спартыўнай работы на ПА».

АД РЭДАКЦЫІ: загадам рэктара слухачы падрыхтоўчага аддзялення С. Додзь, А. Панцялей, І. Хамайко адлічаны з універсітэта.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА філфака разгледзеў на сваім пасяджэнні фельетон «Тайная вячэра». Рашэннем камітэта камсамола факультэта І. Іоннікава выключана з камсамола і па хадайніцтву камітэта камсамола факультэта выключана з ліку студэнтаў універсітэта.

І. КРЭТОВІЧ.
сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.

МАЦАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

І гучалі вершы...

НЕ ВЕДАЮ, як вы, толькі я раней, пачуўшы словы «пасяджэнне кафедры», адразу ўяўляла сабе нейкі сход вузкага кола людзей. Сухія даклады і не менш нудныя справаздачы... Але на пасяджэнні кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі ўсё атрымалася інакш.

Удзельнікаў было шмат, таму што супрацоўнікі кафедры запрасілі студэнтаў факультэта журналістыкі і аддзялення міжнароднай журналістыкі, арганізавалі сустрэчу з цікавымі людзьмі: рэдактарам часопіса «Работніца і сялянка», дэлегатам XXX з'езда КПБ М. І. Карпенка, беларускай паэтэсай Я. Янішчыц і намеснікам рэдактара часопіса «Палітінфарматар і агітатар» Я. І. Сямашкам.

Замест звычайнай у такіх выпадках кафедры на стале з'явіліся самавар і пячэнне. І нудных дакладаў таксама не было, таму што ішла шчырая размова зацікаўленых людзей.

Пачынаючы пасяджэнне, загадчык кафедры І. І. Сачанка адзначыў, што прысвячаецца яно XXVII з'езду КПСС.

— У час з'езда часта гучалі словы «чалавечы фактар», «пераварэнне», але мацней за ўсе чуецца такое кароткае і ёмістае слова «мір»,— сказала М. І. Карпенка.— Мір — тое, што патрэбна зараз дарослым і дзецям усіх краін. Мір павінен быць на планеце, каб у новае стагоддзе мы ішлі без страху за заўтрашні дзень.

— Я таксама памятаю вайну, — уступіла ў размову Я. Янішчыц,— хаця і нарадзілася ўжо пасля Перамогі. Я бачыла інвалідаў і сірот, руіны і папялішчы. І таму я ведаю: вайна — гэта вялікае злачынства. Таму я і пішу вершы ў абарону міру.

А потым гучалі вершы на рускай і беларускай, французскай, балгарскай, арабскай мовах. Прадстаўнікі Сірыі, Непала, Эфіопіі, Афганістана, Малі гаварылі аб прызначэнні чалавека на Зямлі, аб дзейнасці журналістаў, цікавіліся сакрэтамі журналісцкага майстэрства.

Развітваючыся, кожны нёс з сабой прыгатаваны Р. Т. Станкевіч невялікі сувенір —«мартэнічак», што з'яўляецца ў Балгарыі вестуном вясны, шчасця і міру.

М. ЗАГОРСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

На здымках: пасяджэнне кафедры ў студэнцкім інтэрнаце: выступае Я. Янішчыц.

Фота В. КАРАЛЯ.

Студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта сустрэліся з галоўным рэдактарам часопіса «Работніца і сялянка», членам прэзідыума Камітэта савецкіх жанчын, заслужаным дзеячам культуры БССР Марыяй Іосіфаўнай КАРПЕНКА.

М. І. Карпенка:

«ІМКНІЦЕСЯ БЫЦЬ АСОБАЙ»

ПРАДСТАЎЛЯЮЧЫ ГОСЦЮ — былую выпускніцу факультэта і сваю сакурсніцу,— дацэнт кафедры беларускай мовы Ніна Іванаўна Гілевіч гаварыла аб высокай місіі жанчыны ў сучасным

свеце, аб тоеснасці такіх паняццяў, як жанчына, мір і чалавечнасць, аб важнай ролі, якую іграе ў грамадскім жыцці часопіс «Работніца і сялянка», аб энергіі, нястомнасці, таленце Марыі Іосіфаўны.

Сціпла, проста распачала расказ пра сябе Марыя Іосіфаўна: *«Я магу ўпэўнена сказаць: як у кроплі вады адлюстроўваецца сонца, так і ў маім лёсе, учарашнім і сённяшнім дні адлюстроўваецца лёс савецкай жанчыны. Я гавару аб гэтым упэўнена і смела таму, што пабывала ў шматлікіх кутках нашай планеты, размаўляла з рознымі жанчынамі, магу іх параўноўваць і лічу, што самыя шчаслівыя ў свеце — гэта мы».*

Як жа ўзнеслася простая сялянская дзяўчына з Цімкавіч Капыльскага раёна да вышынь міжнароднага прызнання, актыўнага ўдзелу ў працы беларускіх дэлегацый у ААН, шырокай вядомасці? Дарэчы, многія з тых, хто звяртаецца да М. І. Карпенка, называюць яе ў сваіх лістах «намесніцай В. Церашковай па Беларусі»...

Згодна з расказам Марыі Іосіфаўны, сакрэт просты. Любоў да працы, вернасць і адказнасць перад сваёй справай, жаданне як мага больш дапамагчы людзям — вось што прывяло яе да высокіх пасад і ганаровых званняў.

А пачыналася усё са школы, той самай школы імя К. Чорнага, якую яна закончыла з медалём, потым — 5 гадоў універсітэта, размеркаванне... Маючы магчымасць застацца ў сталіцы, выдатніца і член камітэта камсамола абрала працу журналіста на Магілёўшчыне. *«У маёй працоўнай кніжцы ўсяго два запісы: першы сведчыць аб пачатку працы ў газеце, другі — аб назначэнні галоўным рэдактарам «Работніцы і сялянкі», дзе працую ўжо 14 гадоў». Гэта быў адказ на пытанне аб тым, як яна «прыйшла ў галоўныя рэдактары».*

Улюбёна і ўзнёсла расказвала М. І. Карпенка аб часопісе, адным са старэйшых выданняў (хутка яму споўніцца 62 гады), тыраж якога большы, чым тыраж усіх часопісаў рэспублікі, разам узятых (больш за 1 мільён).

Яна расказала аб тым, як складаюцца нумары часопісаў, падбіраецца актуальны матэрыял,

падтрымліваюцца сувязі з чытачамі, аб цяжкасцях і радасцях рэдактарскай і грамадскай працы. Прысутныя даведаліся аб асноўных рубрыках часопіса, аб адлюстраванні вострых праблем сучаснасці, пачулі незвычайныя гісторыі з жыцця людзей.

Былі закрануты і такія спецыфічна жаночыя тэмы, як публікацыя навінак моды, парады па вядзенню хатняй гаспадаркі, выхаванню дзяцей і іншыя. Ну і, зразумела, не абышлося без таго, каб не паразмаўляць аб каханні: якое яно бывае, як адрозніць «свайго адзінага», як падтрымаць і не згасіць высокага агню сапраўднага пачуцця.

На пытанне «Што вы лічыце галоўным для чалавека»? М. І. Карпенка адказала: «Імкніцеся быць асобай. А калі ты асоба, у якой ёсць сваё «я»,— ніякія цяжкасці не змогуць табе перашкодзіць у стварэнні шчасця. Любіце Радзіму. Гэта — усё, што вакол нас, гэта Бацькаўшчына, гэта тыя, каго нават ужо і няма. Але нельга любіць Радзіму абстрактна. Пачынаецца яна з любві да маці, з таго, хто побач з табою, з настаўнікаў, з тых, хто вакол».

М. І. Карпенка расказала аб сваёй рабоце ў прэзідыуме Рэспубліканскага камітэта абароны міру, аб уражаннях ад шматлікіх паездак у ЗША, Англію, аб жыцці жанчын за мяжой.

На развітанне М. І. Карпенка запрасіла студэнтаў супрацоўнічаць у часопісе.

Г. ЮРЧАНКА,
загадчык лінгафоннай лабараторыі філалагічнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: у час сустрэчы.

Фота Ю. ПЕЧУРА.

КЛУБ ЦІКАВЫХ СУСТРЭЧ

Пісьменнік Эдуард Марцінавіч Скобелеў—аўтар твораў, якія заваявалі папулярнасць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Гэта «Маятнік надзеі», «Міласлаў — князь Дрэгавіцкі», драмы «Слёзы Джардана», «Эрзін Неразумны». Нядаўна Эдуард Марцінавіч прыйшоў у госці да студэнтаў універсітэта. Адбылася змястоўная і цікавая гутарка аб новым творы пісьменніка «Катастрофа».

Э. М. Скобелеў: «АБЫЯКАВАСЦЬ — СМЕРЦЬ»

...СПАЧАТКУ быў проста выбух, які ўзняў вакол сябе мора шэрага пылу. Затым з цэнтра пачаў расці велізарны вогненны слуп, яшчэ хвіліна — і ён ператвараецца ў страшэнных памераў грыб... Адбыўся атамны выбух. Што гэта: вайна ці няшчасны выпадак? Але... гасне экран, запальваецца святло. У зале незвычайная цішыня. З залы на сцэну падымаецца пісьменнік Эдуард Марцінавіч Скобелеў — аўтар кнігі «Катастрофа», вядомай чытачам як жывая перасцярога чалавецтва ад атамнага вар'яцтва.

«Хто чытаў мой новы раман?» — так незвычайна і востра пачалася гутарка паміж пісьменнікам і студэнтамі. У зале — лес рук. Сапраўды, раман «Катастрофа» нельга не прачытаць. Гэта рэалістычнае папярэджанне аб тым, чаго ніколі, нідзе не павінна здарыцца.

Далёка-далёка ў акіяне пад блакітным трагічным небам ляжыць востраў Атэкаіта, які канцэнтруе ў сабе ўсе беды сучаснага капіталістычнага свету: алкагалізм, хлусню, карупцыю, самадавольства наёмнікаў, дыктатарства самадураў. І вось усё гэта скалынае атамны выбух. Гібнуць, калечацца ў вогненным варыве людзі. Духоўная смерць папярэджвае фізічную, і чытач бачыць, як смерць маралі страшней за пагібель цела.

Смела і натуралістычна піша Эдуард Скобелеў. Але гэты жудасны натуралізм не адштурхоўвае, чаадварот, прыцягвае чытача. Бо нельга заставацца абыякавым. «Абыякавасць ператварае чалавека ў самую ніжэйшую з жывёл». Гэта пункт гледжання пісьменніка, аб гэтым і твор. «Раман народжаны пачуццём пакутлівай трывогі за чалавека і яго будучыню, жаданнем прамога, непасрэднага, свайго асабістага ўмяшання», — так гаворыць Алесь Адамовіч у прадмове да рамана, і з ім нельга не пагадзіцца.

— Эдуард Марцінавіч, ці можа здарыцца так, што тэму падхопяць так званыя літаратурныя «дзялкі» і ад гэтага яна страціць сваю надзвычайную актуальнасць?

— Не, такога здарыцца не можа. Зразумела, нізкія па мастацкаму ўзроўню кнігі забіваюць увагу чытача, але чалавек, які жыве дзеля таго, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак, ніколі не застанецца ў баку ад рашэння пытання, быць ці не быць чалавецтву.

Існуюць людзі, якія лічаць, што атамная вайна не можа быць ужо толькі таму, што тыя, хто пачне яе, таксама загінуць. Гэта пункт гледжання абываеля. Таму асабліва важна, каб пісьменнік накіроўваў вастрыё пяра супраць такіх людзей. Літаратура, мастацтва могуць уздзейнічаць адразу на мільёны людзей, а дзейнічаць трэба неадкладна. «Мір загінуў ад таго, што чалавеку лягчэй было загінуць, чым змяніцца». Так разважае, крычыць сам сабе галоўны герой твора пісьменнік Фрол, а за ім і астатнія персанажы «Катастрофы». І гэта крычаць не толькі Фрол і тыя, хто зразумеў, гэта крычыць нам час, ад імя ўсіх і да ўсіх звяртаючыся.

— Эдуард Марцінавіч, раман «Катастрофа» увогуле фантастычны твор, але на кнізе няма знаёмага сімвала «НФ», ды і востра Атэкаіта на карце нідзе не знойдзеш?

— Сапраўды, у кнізе ёсць шмат фантастычных дапушчэнняў, але яны выкарыстаны для таго, каб найбольш рэальна намаляваць сучасную капіталістычную рэчаіснасць. Увогуле фантастыка была і застанецца неад'емнай састаўной часткай рэалістычнага мыслення. Гэта як бы два нашы інтэлектуальныя вокі, якія ўдакладняюць ісціну: рэальны факт і яго фантастычная праекцыя. На жаль, у многіх фантастычных творах больш скалазубства, чым жыцця. Вельмі шмат мадэлей грамадства, прапанаваных нам такімі пісьменнікамі, характарызуюцца спрашчэннем сацыяльных і псіхалагічных сувязей, грашаць банальнасцю, адводзяць думкі і пачуцці чытача ў бок ад надзённых праблем рэчаіснасці, з якіх захаванне жыцця на Зямлі — першая.

Запісаў А. ДЗЯДОК,
студэнт факультэта журналістыкі.



«Любая роля — гэта перажывасабленне. І задача артыста — паказваць праз вобраз свайго героя, незалежна ад таго, шэкспіраўскі гэта персанаж альбо сучаснік, тое праблемнае і хвалюючае, чым насычана наша жыццё.

У гледачах хачу бачыць любімыя мною чалавечыя якасці: дабрыню, актыўнасць, сумленнасць і высакароднасць» — так гаварыў са студэнтамі універсітэта артыст маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола Мікалай Карачанцаў.

Фота А. МАКСІМАВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

13 сакавіка 1986 г.
Зак. 224. АТ 07144.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.